Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкевіцкая сярэдняя школа”

# Мой любімы дзіцячы сад
канспект гутаркі ў першай рознаўзроставай групе

Грышчанка Наталія Вікенцьеўна
вышэйшая адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

Мэта: фарміраванне уяўлення дзяцей аб дзіцячым садзе; навучанне дзяцей добразычліва ставіцца да дзяцей і дарослых у дзіцячым садзе; удасканаленне дробнай маторыкі пальцаў рук з дапамогай пальчыкавых гульняў; развіцця пачуцця ўпэўненасці ў самім сабе, пачуцця любові і гонару за сваю групу; выхоўванне ў дзяцей любові да свайго дзіцячага саду.

Матэрыял: Нязнайка, малюнкі з выявамі людзей розных прафесій, музычныя інструменты.

Ход гутаркі

Арганізацыйны момант: дзеці сабраліся ў круг.

Выхавальнік: - Дзеці, да нас сёння ў госці прыйшоў Нязнайка.

Нязнайка: - (выхавальнік трымае ў руках цацку Нязнайку, і кажа ад імя Нязнайкі). - Добры дзень, рабяты! Падкажыце мне, калі ласка, куды я трапіў.

Дзеці: - Добры дзень, Нязнайка!

Выхавальнік: дзеткі, Нязнайка пытаецца, як называецца дом, дзе мы разам з вамі знаходзімся?

Дзеці: - Дзіцячы сад!

Выхавальнік: - правільна, малайцы, рабяты!

Паслухайце верш пра дзіцячы сад:

Я люблю дзіцячы сад:
Тут усё ідзе на лад.
Раніцай я прыхаджу,
У люстэрка я гляджу,
Ці папраўлена спадніца,
Мне бы толькі не спазніцца.
Яшчэ рукі трэба мыць,
Памагчы сталы накрыць.
З лялькамі люблю гуляць
І ў калысцы іх катаць.
На прагулцы ўсе сябры
Лётаюць, бы камары.
У гульні любім мы гуляць,
Прыгаць, бегаць і скакаць.
Пра абед бы не забыцца
І пра сон, а мне не спіцца.
Вось такая я дзяўчынка,
Маці кажа, што з гарчынкай.
Некалі мне засмучацца,
Буду лепей усміхацца.

Выхавальнік: Нязнайка хоча даведацца, што мы робім у дзіцячым садзе. Давайце яму раскажам і пакажам.

(дзеці выконваюць руху ў адпаведнасці са словамі педагога, паўтараючы за ім:

Раніцай я прачнуся, (падымаюць рукі ўверх, пацягваюцца)
Салодка пацягнуся.

Памыцца не забуду (пагладжваюць далонямі твар)

І буду апранацца (імітуюць працэс апранання)

Прыходжу я ў дзіцячы сад (крочаць на месцы, высока падымаючы калені)

Я зарадку рабіць рады (паднімаюць рукі ўгору, разводзяць ў бакі, апускаюць уніз)

Кашу на сняданак з'ем (трымаюць лыжку ўяўную, падносяць яе да рота)

І скажу “дзякуй” усім (ківаюць галавой)

Так малюю (трымаюць уяўны аловак, імітуюць маляванне)

Так гуляю (дзяўчынкі паказваюць, як яны калышуць ляльку, хлопчыкі - як гуляюць у мяч)

Днём трохі адпачну, (складаюць далоні разам, прыціскаюць іх да шчакі, нахіляюць галаву)

Мама прыйдзе, я яе абдыму (абдымаюць сябе).

Выхавальнік: - Малайцы, рабяты!

Выхавальнік: - а цяпер дзеткі, давайце пазнаёмім і пакажам Нязнайцы нашу групу, і раскажам, што ёсць у нашай групе.

Гэта гульнявы пакой, тут мы гуляем, гэта наш любімы пакой. Тут шмат цацак.

Скажыце, а ў цацак ёсць свае хаткі?

Рабяты, пакажыце Нязнайцы, дзе жывуць нашы лялькі, машынкі?

А цяпер, дзеткі, пакажыце Нязнайку, дзе захоўваюцца вашыя рэчы? (у прыёмныя пакоі у шафах).

А як вы знаходзіце сваю шафу? (па малюначках).

Ёсць у нас пакой Нязнайка, дзе дзеці з гразнуляў ператвараюцца ў чысцюль. Што ж гэта за пакой?

Тут таксама ёсць домікі, але не для адзення, а для чаго? (для ручнікоў).

Дзеткі, Нязнайка пытаецца ў мяне, хто прыбірае ў нас у групе?

Хто прыносіць вам есці? (Ірына Іванаўна (памочнік выхавальніка)

А хто гуляе з вамі, ходзіць на прагулку, чытае вам кнігі, малюе з вамі?

Дзеці: Наталія Вікенцьеўна (выхавальнік)

Дзеткі, вы павінны дапамагаць адзін аднаму, клапаціцца, любіць адзін аднаго і, вядома ж, сябраваць, прыходзіць у дзіцячы сад вясёлымі і ў добрым настроі.

Бывае, што мы сварымся і тады настрой псуецца, становіцца сумна, а калі мірымся, то становіцца весела і мы ўсміхаемся. (паказ малюнкаў, сумны выраз твару і вясёлы)

Дзеткі, Нязнайцы вельмі спадабалася ў нас, ён вырашыў з намі застацца.

Якое прыгожае імя – дзіцячы сад!

Дзіцячы сад - гэта ваш другі дом, тут вы праводзіце цэлы дзень з раніцы да вечара.

Хай вам будзе тут добра, весела.